Беларускі гістарычны часопіс. - 2007. - № 7. - С. 27-34.




Сяргей ШЫДЛОЎСКІ

# Як бавіла час прывілеяванае саслоўе Беларусі ў першай палове XIX стагоддзя



*ШЫДЛОЎСКІ Сяргей Алегавіч — выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Нарадзіўся ў 1973 г. у в. Экімань Полацкага р-на Віцебскай вобл. У 1996 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ. Даследуе пытанні гісторыі і культуры Беларусі першай паловы XIX ст. Аўтар больш за 10 навуковых артыкулаў.*

Структура і формы баўлення вольнага часу прывілеяваным саслоўем Беларусі ў першай палове XIX ст. залежалі ад веравызнання, адукацыйнага і маёмаснага стану, пары года, узросту і полу адпачываючых. У паноў, буйных землеўладальнікаў і дробнай шляхты змест паняцця "вольны час" адрозніваўся. "Цяпер толькі паны спяць да дня; за іх іншыя думаюць і працуюць" — так вуснамі героя твора Я.Баршчэўскага "Шляхціц Завальня" характарызаваўся жыццёвы ўклад дробнай шляхты. Але не ўсе паны толькі палявалі і балявалі. Так, у вядомага магната М.К.Агінскага, напрыклад, раніца прызначалася для навучання, палітычных і гаспадарчых перагавораў, працы над мемуарамі, дзень прысвячаўся конным выездам, увечары пачыналася "музыкатворчасць"[1].

Часам прадстаўнікі розных грамадскіх станаў сыходзіліся на адным гульнявым полі. Такую магчымасць давалі ў вёсцы святкаванні Купалля, дажынак або іманіны пана, у горадзе — кірмашы і маскарады. Слова "кірмаш" у XIX ст. азначала не толькі гандаль, заключэнне здзелак, але і гулянне. Звычайна вялікія кірмашы ладзіліся летам і восенню ў гадавыя святы. У канцы 1850-х гг. у гарадах і мястэчках Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губерняў штогод адбываліся каля 270 кірмашоў. Большасць з іх была аднадзённымі, але асобныя доўжыліся тыдзень і больш. Найбуйнейшымі з'яўляліся бешанковіцкі ў Віцебскай, зэльвенскі ў Гродзенскай, любавіцкі ў Магілёўскай губернях, кантрактавы ў Мінску і траецкі ў Гомелі. Свецкую атмасферу свісладкіх кірмашоў з-за багацця разнастайных форм баўлення і шырокага ўдзелу арыстакратыі сучаснікі параўноўвалі з Карлсбадам. На кірмашы прыязджалі прыватныя тэатральныя калектывы, адбываліся цыркавыя выступленні з фокуснікамі, канатаходцамі, гімнастамі. Распаўсюджанымі былі касцюміраваныя танцавальныя вечарыны[2]. Часам кірмашы супадалі са шляхецкімі (дваранскімі) выбарамі, пачаткам школьных вакацый, што яшчэ больш павялічвала іх масавасць і сацыяльную разнастайнасць удзельнікаў.

У перыяд сакавіцкіх кірмашоў у Мінску набываліся, прадаваліся і браліся ў арэнду маёнткі, браліся і выплочваліся пазыкі і працэнты, заключаліся дагаворы на пастаўку ў Рыгу хлеба, карабельнага лесу, пянькі, ільну, ільнянога семя і іншых тавараў. Акрамя таго, наймаліся на службу ў маёнткі аканомы, пісары, слугі. Падчас віленскіх святаюр'еўскіх кірмашоў, каб заплаціць або атрымаць пазыку, у край вярталася арыстакратыя, што пражывала звычайна за межамі краю[3].

Асяродкамі баўлення вольнага часу былі дваранскія сходы, куды перыядычна з'язджаліся на выбары шляхецкія сем'і з правінцыі. Тут жа адбываліся танцавальныя і касцюміраваныя вечары. Пазней падобную функцыю выконвалі клубы.

Рэдуты (або рэсурсы) — камерцыйныя маскарадныя танцавальныя вечарыны — ладзіліся ў буйных гарадах на Запусты, перад вялікім постам. Маска падкрэслівала сацыяльную роўнасць кампаніі адпачываючых, што адпавядала эканамічным інтарэсам арганізатараў рэдутаў, якія імкнуліся прыцягнуць да ўдзелу ў вечарынах шляхту, купецтва, інтэлігенцыю. Маска стварала пэўную авантурную атмасферу ў адносінах полаў. Галоўнымі дзеямі на рэдутах былі танцы і картачная гульня. Тут можна было набываць алкаголь і закуску[4].

Мемуарысты апісваюць містычныя здарэнні, расказваюць пра прароцтвы, якія адбываліся на маскарадах, пра з'яўленне на іх памерлых і інш. Маскарад быў месцам, дзе дапускаліся фрывольныя паводзіны. Як пісаў граф Л.Патоцкі, "у Варшаве ў velізарных, ярка асветленых маскарадных залах таўкуцца, пхаюцца, праціскаюцца тысячы масак. Турчанкі, індускі, цыганкі, яўрэйкі, негрыцянкі, немкі, шведкі, неапалітанкі, іспанкі, кракавянкі, прадстаўнікі розных народаў побач з фантастычнымі выдумкамі міфалагічных багінь, рознакаляровых даміно. Паміж імі арлекін з каламбінаю, чараўнік з вяшчункаю, пілігрым з пілігрымкаю, пастушкі, літоўскія вайдэлоткі, русалкі, усе пад маскамі, і кожная цябе зачэпіць, піша на руцэ іерогліфы або лічбы. Адна пытаецца, ці пазнаеш яе, другая заяўляе, што цябе кахае, іншая запрашае да сябе назаўтра, дае найчасцей выдуманы нумар дома. А тая просіць, каб пачаставаў яе марожаным, цукеркамі, вячэраю, а часам нават пончыкам..."[5].

У Мінску на Высокім рынку ў доме Гейдукевіча адбываліся касіны (танцавальныя вечары), якія арганізоўваліся асабліва часта зімой. У Вільні касіны праводзіліся пад апекай вядомага пісьменніка і грамадскага дзеяча Я.Ходзькі. Тут папулярным месцам іх быў дом Мюлера. Баль часта доўжыўся да ўсходу сонца. Танцавалі мазуркі, вальсы. У дамах шляхты ладзіліся і сямейныя танцавальныя вечарыны для родных, сяброў і суседзяў. У час посту, калі танцаваць не дазвалялася, праводзіліся канцэрты класічнай музыкі, інтэлектуальныя гульні.

Баль з'яўляўся важнай часткай стылю жыцця прывілеяванага саслоўя, палітычных і матрыманіяльных планаў арыстакратыі. Галоўным бальным сезонам была зіма. Склалася традыцыя даваць пышныя балі і ўрачыстыя абеды ў гонар шаноўных людзей або з нагоды пэўных падзей. У Вільні ў 1812 г. балі ў гонар расійскага і французскага імператараў узнімаліся да вышынь мастацтва[6].

Танцавалі на балі пад аркестр. Адкрывалі яго менуэтам, пазней у моду ўвайшоў паланез. Гэты танец уяўляў сабой папарнае шэсце ланцугом пад музыку праз бальную залу, часам праз увесь палац. Пасля паланеза звычайна пачыналася кадрыля. Існавалі расійская, нямецкая, французская (кантрданс) і польская кадрыля. Яна дапускала больш вольнасці ў камбінаванні танцавальных фігур, што ператварала гэты танец у сапраўдную мастацкую фантазію выканаўцаў. У канцы XVIII—пачатку XIX ст. вялікую папулярнасць у моладзі набыў вальс. Галоўным танцам і ўпрыгажэннем балю была мазурка. Характэрнай асаблівасцю мазуркі з'яўлялася мужчынскае сола. Вальс і мазурка спрыялі рамантычным адносінам. Заканчваўся баль катыльёнам. Гэты танец-гульня выконваўся на матыў вальса.

Непераўзыдзенымі спецыялістамі па арганізацыі імпрэзаў у гонар шаноўных асоб з'яўляліся езуіты. Сучаснікам запомніліся прыёмы, арганізаваныя імі ў Полацку. Грандыёзныя ўрачыстасці былі наладжаны ў час адкрыцця Полацкай езуіцкай акадэміі ў 1812 г. У іх удзельнічалі школьныя і вайсковыя музычныя калектывы, ладзіліся касцюміраваныя вулічныя працэсіі, дэкламацыі на розных мовах, тэатралізаваныя выступленні, феерверкі, ілюмінацыя. Кульмінацыяй святкавання стаў салют з 50 гармат. На ўрачыстым абедзе прысутнічалі больш за 100 ганаровых удзельнікаў[7].

Некаторыя формы баўлення часу мелі абрадавы характар. Кожную нядзелю вясковая шляхта збіралася ў парафіяльным касцёле. Для засцянкоўцаў наведванне касцёла з'яўлялася не толькі рэлігійным абавязкам, але і нагодай прадэманстраваць абновы ў адзенні і добрыя манеры. Найбольш багатыя на забавы былі Каляды, Масленіца і Зялёныя святкі (перад Сёмухай. — **С.Ш.**)[8].

Падчас Каляд дзяўчаты, шляхцянкі і сялянкі, займаліся варажбой. На Масленіцу ладзіўся так званы куліг — раз'езды па суседзях на санях вялікай шляхецкай кампаніяй. Напярэдадні Вялікадня рыхтаваліся да споведзі, наведвалі астрогі і шпіталі з міласцінай. На Вялікдзень шляхта наладжвала ілюмінацыі са смаляных бочак, салют са стрэльбаў і марцір. На Юр'я землеўладальнікі і сяляне запрашалі святароў у поле адправіць імшу. Тройца была часам усеагульных забаў і гульняў, якія адбываліся звычайна за паселішчам. Да Купалля прымяркоўваліся самыя буйныя мясцовыя кірмашы. Агульным святам з'яўляліся дажынкі з уласцівай ім патрыярхальнасцю, калі паны запрашалі сялян у свой двор, частавалі іх, удзельнічалі ў агульных забавах. Нагодай для збору гасцей маглі быць таксама імяніны, хрэсьбіны, заручыны, вяселле і г.д.

На арганізацыю святкавання беларуская шляхта выдаткоўвала значную частку сваіх прыбыткаў. Так, у час масленічнага кулігу госці маглі цалкам знішчаць запасы яды, гарэлкі і він гаспадароў. Існавала традыцыя затрымліваць гасцей на некалькі дзён пад пагрозай зняць колы з іх вазоў[9]. У шляхецкіх дварах часта гасцявалі адразу па некалькі сямействаў сваякоў разам з гувернёрамі, слугамі. Падобныя наведванні прадугледжвалі ў будучым візіты гаспадароў да сваіх гасцей.

Паступова стала модным запрашаць у вясковыя шляхецкія сядзібы навукоўцаў, паэтаў, музыкантаў,

мастакоў. Ад такіх запрашэнняў да магнатаў не адмаўляліся нават прафесары Віленскага універсітэта. Мастакі гасцявалі ў фальварках цэлымі тыднямі, малявалі партрэты гаспадароў або рабілі замалёўкі мясцовых краявідаў.

Заможныя шляхецкія сем'і ў сваіх гарадскіх рэзідэнцыях зімой трымалі так званыя адкрытыя дамы, у якіх шыкоўны абед ці вячэру ладзілі амаль штодня або ў асобна вызначаны "прыёмны" дзень. Падставай для такой гасціннасці часта быў палітычны або матрыманіяльны разлік.

Перыядычна сярод шляхты ўзнікала мода на містыфікацыі, ладзіліся жарты на 1 красавіка (Primum aprilis), строіліся "фіглі". Моладзь містыфікавала старэйшых, радавітыя — простанароддзе, афіцэры — студэнтаў і наадварот. Жарты мелі не заўсёды бяскрыўдны характар.

У канцы XVIII—пачатку XIX ст. атрымалі папулярнасць сеансы "жывёльнага магнетызму", ці месмерызму. Гэты містычны кірунак быў абавязаны сваім з'яўленнем нямецкаму лекару-фізіятэрапеўту Ф.А.Месмеру, які прапагандаваў свой метад лячэння ад нервовых захворванняў і меланхоліі. Прыхільнікамі містычнага вучэння А.Тавянскага з'яўляліся А.Міцкевіч і А.Ходзька. Былі папулярныя вечаровыя і начныя прагулкі на могілках, "выкліканне духаў". У дамах небагатай шляхты доўгімі зімовымі вечарамі расказвалі пра ваўкалакаў і іншыя жахі.

Значную частку вольнага часу шляхта бавіла сярод родных і сяброў. Тут панавалі гульні і забаўкі, якім быў уласцівы інтэлектуальны кампанент[10]. Класічнымі "дамашнімі" гульнямі з'яўляліся фанты і шарады.

Захоўвалі папулярнасць шашкі — на 64 палі, "польскія" шашкі мелі 100 палёў і па 20 фігур з кожнага боку. На такой дошцы гулялі ў "ваўка", "млынок", трыктрак. Мелі прыхільнікаў і шахматы. Старажытнай гульнёй у косці бавіліся звычайна ў корчмах, на кірмашах. У більярд гулялі нават на грошы.

Неад'емнай часткай забаў была гульня ў карты. З'яўленне іх у Каралеўстве Польскім адносяць да XVI ст., затым яны пачалі распаўсюджвацца на беларускія землі. Аднак яшчэ ў канцы XVIII ст. гульня ў карты лічылася неарыстакратычным заняткам. У XIX ст. існавалі фламандскія, польскія, але найбольшую папулярнасць мелі французскія картачныя гульні. Картачныя гульні падзяляліся на камерцыйныя (пікет, ламбер, віст, прэферанс і інш.), азартныя (банк, штосе, фараон і інш.) і аматарскія. Першыя мелі грамадскае прызнанне, другія фармальна асуджаліся, але былі ў модзе. Аматарскімі гульнямі забаўляліся дзеці і старыя, дарослыя жанчыны і мужчыны на грамадскіх зборах і ў сям'і. Такія патрыятычныя студэнцкія суполкі, як філаматы і Дэмакратычнае таварыства Ф.А.Савіча, асуджалі картачныя гульні, ставілі за мэту адцягнуць моладзь ад карт.

Прычынай гульні ў карты называлі жаданне атрымаць моцныя ўражанні, што было цалкам у рэчышчы моднага байранізму. Моладзь бавілася картамі за поўнач з келіхам у руках, людзі сталага ўзросту гулялі ў карты на балях і вечарах, пакуль моладзь



*Польскія ігральныя карты.* XVI ст.

танцавала. Шулерамі лічылі тых, хто гуляў для заробку. Шырокае распаўсюджанне азартныя картачныя гульні набывалі ў перыяды знаходжання ў краі вялікай колькасці расійскіх вайскоўцаў (у час вайны 1812 г., падаўлення нацыянальна-вызваленчых паўстанняў 1794, 1830—1831 і 1863—1864 гг.). Паводле сведчанняў сучаснікаў, расійскія вайскоўцы гулялі і на рэчы (сярэбраны і залаты посуд, гадзіннікі, зброю, збрую, каштоўныя камяні і г.д.). У іх азартных гульнях актыўна ўдзельнічалі варшаўскія і віленскія шулеры[11]. За картачным сталом прыдворныя і чыноўнікі вырашалі кар'ерныя і палітычныя пытанні. Пройгрыш у карты з'яўляўся часам замаскіраванай формай хабару. Памешчыкі прайгравалі ў карты не толькі вялікія сумы грошай, але і маёнткі, прыгонных.

Напрыканцы XVIII ст. з'явілася мода на латарэі. Яны ладзіліся як на грамадскіх пачатках, так і пад апекай дзяржавы. У Вільні дабрачынныя таварыствы выбіралі квестараў, якія займаліся арганізацыяй фантавых латарэй на карысць маламаёмасных. Фантамі маглі быць, напрыклад, дываны, гадзіннікі, букеты кветак, нават шаблі, якія разыгрываліся ў час дабрачынных канцэртаў або баляў. Латарэйнымі білетамі часта служылі набытыя для ўваходу на канцэрт ці баль квіткі.

Тых, каму не падабаліся карты ці іншыя гульні, у салонах чакалі спецыяльныя столікі з часопісамі мод, гравюрамі, літаграфіямі, карыкатурамі. Чытанне было мала папулярнай формай баўлення часу нават сярод прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя, а засцянковая шляхта не мела і сродкаў, каб набываць кнігі. Было пашырана меркаванне пра "несур'ёзнасць" і нават шкоднасць такога занятку, як чытанне. Лічылася, што замежная літаратура, асабліва французская, разбэшчвае моладзь. Попытам карысталася літаратура на польскай і французскай мовах, меншым — на нямецкай і рускай[12]. Пашыраны былі малітоўныя кнігі, музычныя ноты, падручнікі, сярод дробнай шляхты — календары (віленскі, бярдзічаўскі і інш.), а таксама Біблія.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на рускамоўныя выданні падпісваліся губернскія публічныя бібліятэкі, той, хто жадаў, мог атрымаць поштай расійскую перыёдыку — часопісы "Современник", "Отечественные записки", "Москвитянин". У Вільні ў цукернях можна было пачытаць польскамоўныя выданні ("Kurier Litewski", "Dziennik Wileński", "Tygodnik Wileński", "Wiadomości Brukowe" і інш.). У невялікія гарады, мястэчкі, маёнткі кнігі і перыёдыку прывозілі студэнты, калі прыязджалі на вакацыі, або шляхта, што вярталася з кірмашоў ці шляхецкіх выбараў. Паступова ўплыў прэсы на грамадскую думку павялічваўся.

Вучоба ў каталіцкіх навучальных установах прывучала да чытання лацінскіх і старажытнагрэчаскіх тэкстаў. Класіцызм доўга не саступаў рамантычнай плыні, што фарміравалася ў польскамоўнай літаратуры дзякуючы найперш намаганням беларуска-літоўскіх аўтараў. Імпульс да творчага пошуку многія з іх атрымалі праз лекцыі прафесара Л.Бароўскага ў Віленскім універсітэце. Публічныя літаратурныя чытанні, якія ладзіліся час ад часу Л.Бароўскім, заахвочвалі моладзь да арыгінальнай і перакладчыцкай творчасці, збірання і вывучэння фальклору. У асяроддзі адукаванага грамадства фарміраваўся рамантычны культ паэта ("прарока", "вайдэлота"), што пазней праявілася ў стварэнні "віленскай рамантычнай школы" (А.Міцкевіч, Я.Чачот і інш.).

Заняткі літаратурай былі сродкам павышэння сацыяльнага статусу для беднай правінцыяльнай шляхты. Вершы перапісваліся, перасылаліся ў лістах, завучваліся на памяць. Пашырэнне адукацыі ў краі і "пралетарызацыя" шляхты спрыялі таму, што аматарскія заняткі "прыгожай славеснасцю" рабіліся для шэрага прадстаўнікоў шляхецкай інтэлігенцыі прафесійным заняткам.

Шырокім чытацкім попытам карысталіся раманы Э.Сю, А.Дзюма-бацькі, проза Ф.Булгарына, творы Г.Равускага. Значную ролю ў патрыятычным выхаванні шляхецкай моладзі адыгралі "Гістарычныя спевы" Ю.Нямцэвіча. Але хіба толькі Ю.Крашэўскі мог сапернічаць па папулярнасці з французскімі аўтарамі. Сучаснікі сцвярджалі, што менавіта Ю.Крашэўскі прымусіў мясцовых аматараў літаратуры чытаць на польскай мове[13].

Паступова як у шляхецкіх сем'ях, так і ў салонах распаўсюджвалася чытанне ўголас. Панам чыталі камердынеры, а паненкам у час іх вечаровых "работак" — кавалеры. Папулярным заняткам было слуханне спеваў "дзядоў" — народных лірнікаў і гусляроў, многія з якіх называлі сябе ветэранамі напалеонаўскіх войнаў або вызваленчых паўстанняў. І сярод самой шляхты не згасала імкненне да складання вусных гістарычных, часам апакрыфічных, апавядаў-паэм на палітычныя, гістарычныя, паляўнічыя, містычныя тэмы. Папулярнасцю карысталіся гісторыі пра родавыя праклёны.

У шляхецкім асяродку распаўсюджваліся разнастайныя рукапісныя творы — як узоры аматарскай альбомнай літаратуры. Спецыфічнай з'явай у літаратуры стала і антыўрадавая сатыра. Сустракаліся творы і на беларускай мове, як, напрыклад, паэма "Энеіда навыварат" ці пераклады твораў А.Міцкевіча на беларускую мову. Папулярнымі аўтарамі гэтай рукапіснай літаратуры былі Я.Баршчэўскі, Я.Аношка, Ф.Рысінскі. Чытацкае і аўтарскае кола яе складала суседская шляхецкая супольнасць. Паненкі заводзілі літаратурныя альбомы для аўтографаў вядомых літаратараў, іншых знакамітых асоб, запісаў сваіх сяброў.

На пачатку XIX ст. распаўсюджваюцца прыватныя бібліятэкі-чытальні, у якіх за плату жадаючыя маглі пазнаёміцца з навінкамі літаратуры і перыёдыкай. Адной з першых была створаная ў 1840-я гг. "сумесная сяброўская бібліятэка" братоў А.І. і Э.І.Вярыга-Дарэўскіх у Віцебску. Кнігі для яе выпісваліся з віленскай кнігарні Я.Завадскага. Карысталіся гэтым кнігазборам каля 100 чалавек. Плата ўносілася па добрай волі чытачоў. Кнігамі можна было карыстацца таксама ў гімназічных, семінарскіх, клубных бібліятэках.

Агульнаеўрапейскую вядомасць набылі прыватныя кнігазборы Радзівілаў, Храптовічаў, Тышкевічаў і інш. Небагатыя чыноўнікі набывалі кнігі і выпісвалі часопісы ў складчыну, абменьваліся імі. Новыя выданні выходзілі дзякуючы зборам ад падпіскі, якую ладзілі часам самі аўтары сярод сваіх родных і суседзяў. Аматары чытання з правінцыі ездзілі за кнігамі ў Вільню і Варшаву. Падчас вялікіх кірмашоў, калі свае тавары прывозілі кніжныя гандляры з Вільні, чытачы правінцыяльных гарадоў мелі магчымасць набываць у іх новыя кнігі. Неабходную літаратуру можна было заказваць па кніжных каталогах.

У Вільні месцам збору інтэлігенцыі былі кнігарня Я.Завадскага, рэдакцыі віленскіх газет, гурткі А.Кіркора, І.Лялевеля, Э.Мастоўскага, А.Адынца, Р.Падбярэзскага і інш. Навуковымі асяродкамі з'яўляліся Віленскі музей Е.Тышкевіча, Віленская археалагічная камісія[14].

З інтэлектуальных заняткаў прывілеяванага саслоўя можна назваць таксама гаспадарчыя трактаты (І.Манькоўскага, Г.Цюндзявіцкай і інш.). Распаўсюджаным было эпісталярнае мастацтва. Лісты са сталіц або з замежжа замянялі нярэдка прэсу. Пэўнай формай вуснай літаратурнай творчасці з'яўляліся



*У літоўскай карчме ў святочны дзень.* Гравюра XIX ст.

досціпы, максімі. Высока цаніліся паэтычныя імправізацыі, уменне пісаць эпіграмы. З нагоды сямейных святкаванняў складаліся вершы-віншаванні, застольныя тосты.

Аматары навукі займаліся прыватнымі даследаваннямі ў бібліятэках, праводзілі археалагічныя раскопкі, збіралі калекцыі антыкварыяту. Найбуйнейшымі прыватнымі калекцыямі з'яўляліся зборы Радзівілаў, Тышкевічаў, Агінскіх, А.Плятэра, К.Тызенгаўза, Э.Чапскага, Т.Нарбута, П.Румянцава. Важнай часткай шляхецкага выхавання было вывучэнне пытанняў генеалогіі. Папулярнасцю карысталіся публічныя лекцыі віленскіх прафесараў І.Лялевеля, Ю.Галухоўскага і інш. Для жанчын публічныя лекцыі з'яўляліся рэдкай магчымасцю далучыцца да універсітэцкай навукі[15].

Збіраліся і апрацоўваліся народныя песні, паданні. Пашыраліся розныя формы эстэтычнага выхавання моладзі. Дзяўчаты павінны былі добра танцаваць, спяваць, іграць на музычных інструментах, распаўсюджаным было таксама навучанне маляванню. Дзяўчаты з заможных сем'яў ігралі на фартэпіяна, арфе, гуслях, навучаліся спевам у кляштарах і пансіёнах, бедныя вучыліся іграць на "польскай гітары".

У першай палове XIX ст. культурным цэнтрам краю была Вільня. Памешчыкі з Віленшчыны, Гродзеншчыны, Міншчыны мелі звычай па некалькі месяцаў жыць у Вільні, прыязджалі сюды на карнавалы, шляхецкія выбары або на заключэнне кантрактаў. Дабрачынныя таварыствы ладзілі імпрэзы з удзелам як замежных выканаўцаў, так і мясцовых прафесіяналаў — тэатральных і касцельных музыкаў. У горадзе выступалі з канцэртамі віяланчэлісты, піяністы, скрыпачы, оперныя спевакі з Дрэздэна, Варшавы, італьянскіх гарадоў.

Аматарскія аркестры з пяці-шасці інструментаў, хоры, дуэты дэманстравалі сваё майстэрства на сямейных урачыстасцях, загарадных гуляннях. Распаўсюджанымі танцамі ў выкананні аматараў з'яўляліся мазурка, полька, кракавяк. Прыватныя аркестры прымалі ўдзел у драматычных і оперных пастаноўках публічных тэатраў. Найбольш папулярнымі ў шляхецка-чыноўніцкім асяроддзі музычнымі інструментамі былі фартэпіяна, скрыпка, гітара, віяланчэль і флейта. У шляхецкіх дамах часам сустракаліся унікальныя інструменты еўрапейскіх майстроў.

У дамах Юндзілаў, Ратынскіх, Манюшкаў адбываліся камерныя канцэрты. Рэпертуар прафесійных тэатраў уключаў творы італьянскіх, французскіх, польскіх, венгерскіх, нямецкіх кампазітараў. Агляды музычнага жыцця краю друкаваліся ў варшаўскім часопісе "Ruch muzyczny", чытачамі і карэспандэнтамі якога былі прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя Беларусі[16].

Стварэнне ананімных польскамоўных песень са злабадзённым зместам у два (кракавяк) або ў тры (мазурка) тэмпы стала ў першай чвэрці XIX ст. пашыранай з'явай сярод студэнцкай і гімназічнай моладзі. Пісаліся таксама песні на беларускай мове, якія мелі пэўную сацыяльную накіраванасць і спяваліся на матывы папулярных народных мелодый. Выконваліся і народныя беларускія песні. Але большасць рэпертуару аматарскіх канцэртаў складалі польскамоўныя і франкамоўныя творы. Уваходзілі ў моду арыі з італьянскіх опер і аперэт. Карысталіся папулярнасцю рамансы.

Адной з форм баўлення вольнага часу прывілеяваным саслоўем быў тэатр. Асабістая тэатральная ложа з'яўлялася паказчыкам сацыяльнага статусу

асобы, яна была своеасаблівай філіяй свецкага салона. Наведванне тэатра было нагодай для дэманстрацыі модных строяў, наладжвання і падтрымання свецкіх кантактаў. У пачатку XIX ст. у Мінску існавалі тры сталыя польскамоўныя трупы. З 1845 г. у Віцебску пачала дзейнічаць драматычна-балетная трупа. У 1846 г. у Гродзенскай губерні працавалі ўжо 5 драматычных тэатральных труп. Вядомы імёны больш за 50 антрэпрэнёраў, музычна-тэатральныя калектывы якіх гастралявалі ў першай палове XIX ст. у Беларусі[17].

Акрамя прафесійных існавалі аматарскія і прыватнаўласніцкія тэатральныя калектывы. Яны выступалі звычайна з пэўнай нагоды — сямейных урачыстасцей, грамадскіх падзей, дабрачынных акцый. Ставіліся пераважна камедыі і вадэвілі на польскай, французскай і рускай мовах. Карысталіся папулярнасцю "жывыя карціны" — сюжэты з біблейскай і сусветнай гісторыі, а таксама з літаратуры, міфалогіі. Да гэтых тэатралізаваных забаў актыўна далучалі дзяцей, якія выконвалі ролі амураў ці анёлаў. Былі распаўсюджаны таксама псеўданародныя букалічныя паказы з жыцця цыганоў, шатландцаў, фламандцаў, у час якіх выконваліся нацыянальныя песні і танцы[18].

Папулярызацыяй тэатральнага мастацтва займаўся Я.Ходзька, які заахвочваў грамадства ствараць аматарскія тэатры ў невялікіх мястэчках і шляхецкіх дварах. У Вільні Дом дабрачыннасці пад апекай Я.Ходзькі арганізоўваў па кантрактах тэатралізаваныя аматарскія вечарыны з паказам "жывых карцін", у пастаноўцы якіх браў удзел прафесар Віленскага універсітэта мастак Я.Рустэм.

Пасля паўстання 1830—1831 гг. улады пачалі падыходзіць да тэатральнага рэпертуару больш патрабавальна, падвяргаць яго цэнзуры. У ходзе тэатральнай рэформы 1845—1847 гг. былі створаны тэатральныя дырэкцыі, адной з функцый якіх з'яўляліся нагляд і цэнзура тэатральнага рэпертуару. Тэатры абавязваліся ставіць не толькі заходнееўрапейскія і польскія, але і рускамоўныя драматычныя творы.

Падчас тэатралізаваных выступленняў у салонах і на дабрачынных канцэртах праводзіліся зборы ахвяраванняў. Публічнымі відовішчамі былі экзамены ў каталіцкіх навучальных установах. У прысутнасці выкладчыкаў і бацькоў вучні экзаменавалі адзін аднаго, удзельнічалі ў дыспутах, займаліся дэкламацыяй, разыгрывалі драматычныя сцэнкі. Як заўважыў сучаснік, у правінцыі судовыя пасяджэнні замянялі публіцы тэатральныя спектаклі. Прамовы адвакатаў (глосы), заявы бакоў судовага пасяджэння (маніфесты) друкаваліся ў прэсе, перапісваліся і распаўсюджваліся[19].

Эстэтычныя густы і запатрабаванні шляхты ўлічваліся архітэктарамі пры планіроўцы паркаў, закладцы садоў у сядзібах, пры разбіўцы кветнікаў і аранжарэй. Вырошчванне кветак звычайна з'яўлялася заняткам жанчын. Экзатычныя гатункі выпісваліся з-за мяжы, гаспадыні абменьваліся насеннем і вопытам вырошчвання і догляду за кветкамі з суседкамі. Жанчыны і дзяўчаты складалі гербарыі і букеты, рабілі замалёўкі кветак у альбомах.

Важнай падзеяй у жыцці шляхты і неад'емнай часткай выхавання моладзі з'яўлялася вандроўка ў замежныя краіны з мэтай навучання, аздараўлення, азнаямлення з тэндэнцыямі моды, па рэлігійных меркаваннях. У магнатаў у вандраваннях праходзіла значная частка жыцця. Напрыклад, князь Ф.Сапега амаль штогод накіроўваўся ў падарожжа. Вяртаўся на радзіму звычайна ў канцы лета, займаўся гаспадарчымі і сямейнымі справамі, а позняй восенню зноў выпраўляўся за мяжу. Папулярнасцю ў магнатаў карысталіся Парыж, Варшава, Дрэздэн, італьянскія гарады, Шлёнскія воды, Карлсбад, воды Зальцбурга, адпачынак на моры пад Круляўцом[20].

Найбольш вядомым месцам адпачынку і аздараўлення ў Беларусі былі Друскенікі. Там меліся парк для гулянняў, спецыяльныя ванны для медыцынскіх працэдур, галерэя для шпацыру ў час дажджу, рэстараны, кнігарні. На курорце дзейнічаў тэатр, прыязджаў аркестр з Вільні, запрашаліся еўрапейскія "зоркі". Для адпачываючых выдаваўся зборнік "Ундзіна", з якім супрацоўнічалі вядомыя літаратары. Ладзіліся балі, прагулкі на лодках па Нёмане. Акрамя Друскенікаў адпачываць і лячыцца ў краі можна было на Бірштанскіх і Стаклішскіх водах, у сернай водалячэбніцы "Лазенкі" каля Відзаў, у Боркаўшчыне на Ушаччыне[21].

У першай палове XIX ст. атрымалі пашырэнне вандроўкі па роднай зямлі. На падставе іх складаліся літаратурныя дзённікі. Прыкладам твораў гэтага жанру можна назваць нарысы Ю.Крашэўскага, А.Плуга, А.Кіркора, У.Сыракомлі[22].

З развіццём прыродазнаўчых навук, медыцыны і гігіены грамадства таксама скіроўвала больш увагі на забавы на вольным паветры. Па ініцыятыве Адукацыйнай камісіі фізічныя практыкаванні былі ўключаны ў школьныя праграмы. Папулярызатарам фізічных заняткаў у пачатку XIX ст. з'яўляўся прафесар медыцыны і хіміі Віленскага універсітэта А.Снядэцкі.

У Вільні і іншых гарадах пачалі ўзнікаць першыя гімнастычныя школы і ваенна-спартыўныя таварыствы, набылі папулярнасць лыжы, гульні з мячыкам, валанам. Не былі забытыя і такія традыцыйныя формы зімніх шляхецкіх забаў, як катанне на санях, летам — конныя прагулкі.

Да традыцыйных шляхецкіх забаў адносілася паляванне. Калі раней яно з'яўлялася "галоўным заняткам вышэйшага класа і школай вайсковага побыту", выкарыстоўвалася, каб назапасіць ежы для магнацкага двара ці войска, то ў XIX ст. паляванне пачынае набываць рэкрэацыйна-спартыўны характар. У ім пачалі браць удзел жанчыны.

Конныя скачкі былі пераважна забавай моладзі. Прафесійныя скачкі адбываліся ў Варшаве, а таксама падчас буйных кірмашоў. Пароды чыстакроўных польскіх коней разводзіліся ў маёнтках Сапегаў, Пацеёў, Радзівілаў. Карысталіся вядомасцю конныя заводы Храптовічаў, Раецкіх, Рдултоўскіх. Значнымі падзеямі для аматараў коней былі кірмашы ў Міры,

Бешанковічах, Зэльве, Асвеі[23]. Аматары арганізоўвалі ў сваіх сядзібах спецыяльныя аб'язджальні, дзе коней вучылі вальтыжыроўцы, кадрылі і іншым практыкаванням. Аб'ездкай коней займаліся нават некаторыя жанчыны.

Актыўнаму адпачынку на прыродзе і станаўленню краязнаўчых заняткаў шляхты спрыялі экскурсіі па ваколіцах. Яны ўключалі наведванне мясцін, дзе меліся каштоўныя помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Такія прагулкі маглі мець на мэце наведванне шляхецкіх сядзіб, якія таксама захоўвалі шмат гістарычных рэчаў і разнастайных калекцый ці служылі ўзорам гаспадарання. Не абміналіся і помнікі прыроды. Пачалі выдавацца даведнікі па памятных мясцінах буйных гарадоў і іх ваколіц. Рэлігійныя святыні і месцы язычніцкіх культаў таксама цікавілі адукаванае грамадства. Загарадныя шпацыры набывалі часам элемент дэманстрацыі патрыятычных пачуццяў, як, напрыклад, наведванне віленскімі інтэлігентамі магілы рэктара Віленскага універсітэта, актыўнага члена Адукацыйнай камісіі Я.Снядэцкага. Шырокае распаўсюджанне набывае паломніцтва да рэлігійных мясцін і цудатворных ікон Маці Божай у Бялынічах, Жыровічах, Чанстахове. Адмысловае шанаванне меў абраз Вастрабрамскай Маці Божай у Вільні.

Гарадское чыноўніцтва летам любіла бавіць час на рыбнай лоўлі на рачулках і азёрах. Шляхта і гараджане не адмаўляліся ад збору грыбоў, арэхаў і ягад. Эпіцэнтрамі "моднага" жыцця ўлетку рабіліся гарадскія бульвары, грамадскія паркі і сады, дзе ўвечары іграла музыка, а на святы наладжваліся ілюмінацыі і феерверкі.

Віцябляне, напрыклад, любілі хадзіць глядзець на захад і ўсход сонца, на крыгаход падчас веснавой паводкі. Шырока праводзіліся сямейныя і суседскія маёўкі, ці, як іх называлі на англійскі манер, пікнікі — гулянні ў маляўнічых прыгарадных ваколіцах з раскладаннем вогнішчаў, гатаваннем юшкі. Масавыя паломніцтвы на прыроду традыцыйна адбываліся на Купалле і Зялёныя святкі. Правядзенне таварыскіх сустрэч пад выглядам маёвак было завядзёнкай у філаматаў[24]. Загарадныя прагулкі мелі часам і пазнавальныя мэты.

Абавязковым пунктам наведвання падчас загарадных шпацыраў мужчынскай кампаніі былі корчмы. Некаторыя модныя шынкі стыхійна ператвараліся ў дыскусійныя клубы, дзе за куфлем піва абмяркоўваліся палітычныя і іншыя пытанні. Засцянковай шляхце карчма замяняла "клуб, сойм і біржу".

Жанчыны наведвалі цукерні, дзе можна было паспытаць шакалад, салодкія прысмакі. Спецыфічнай формай баўлення часу для жанчыны былі "работкі" — рукадзелле, асабліва ў зімовыя вечары. У час іх шляхцянкі перабіралі насенне кветак, выраблялі штучныя кветкі, карункі, вышывалі карціны, спявалі песні. Часам "работкі" выкарыстоўваліся для дабрачынных мэт, і тады кабеты шылі кашулі і чапцы для жабракоў і бедных, рабілі корпію для параненых. Жанчыны часам захапляліся медыцынай, выраблялі саматробныя пластыры, настойкі.

Дзеці з прывілеяванага саслоўя капіравалі забаўкі дарослых. Іх цацкі імітавалі зброю, коней, жаўнераў. Дзеці заможных бацькоў атрымлівалі ў падарунак заходнееўрапейскія механічныя цацкі. Хлопчыкі любілі гуляць у вайну, прычым іх гульні нагадвалі пра гістарычныя падзеі — на адным баку змагаліся ліцвіны, на другім — казакі. Многія дзіцячыя групавыя гульні амаль што без змен дайшлі да нашага часу — "сляпая бабка", ці жмуркі, хованкі, гульня ў ваўка і гусей і інш. Яны былі агульныя для дзяцей шляхты і сялян. Дзецям пачатку XIX ст. вядомы быў і мяч — "палянт" (скручаны з ануч і абшыты скурай). Гульнёй вучняў езуіцкіх калегіумаў з'яўлялася пальцата (фехтаванне кіямі, абкручанымі саломай), у час якой адна каманда бараніла "крэпасць", а другая спрабавала яе ўзяць. Жорсткія практыкаванні былі папулярныя і ў свецкіх школах. Як і дарослыя, дзеці гулялі ў карты, косці, шахматы, шашкі, більярд і інш.[25]. Любімым відовішчам дзяцей былі прадстаўленні з удзелам дрэсіраваных мядзведзяў са славутай "Смаргонскай акадэміі". Пасля яе закрыцця ў канцы XVIII ст. (паводле іншых звестак, у пачатку XIX ст.) падобныя выступленні ладзіліся вандроўнымі акцёрамі з Расіі. Для дзяцей арганізоўваліся балі, маскарады. Дзеці прымалі актыўны ўдзел у дабрачынных канцэртах, спектаклях, "жывых карцінах" на міфалагічныя і гістарычныя тэмы.

Што тычыцца баўлення вольнага часу святарствам, то яго формы былі падобныя да забаў шляхецтва. Гэта тлумачыцца тым, што значная частка каталіцкага духавенства рэкрутавалася са шляхецкіх сем'яў, а шляхта была заканадаўцай моды для ўсіх саслоўяў. Духоўныя асобы не цураліся нават такой рыцарскай забавы, як паляванне[26].

Такім чынам, формы баўлення вольнага часу прывілеяваным саслоўем Беларусі ў першай палове XIX ст. захоўвалі многія традыцыйныя рысы, аднак яны не пазбеглі трансфармацый, што вынікалі з тэндэнцый урбанізацыі грамадства.

Развіццё адукацыі і выдавецкай справы садзейнічала распаўсюджванню ідэй асветніцтва і рамантызму, а пазней пазітывізму і іх уплыву на характар забаў прывілеяванага саслоўя. Грамадскія забавы сталі больш масавыя і дэмакратычныя. Пры баўленні вольнага часу акрамя сацыяльнай прэзентацыі прывілеяванае саслоўе пачало больш увагі надаваць забавам, карысным для здароўя і інтэлектуальнага развіцця. Адной з важных прыкмет культуры адпачынку першай паловы XIX ст. стала яе далейшая камерцыялізацыя і прафесіяналізацыя. Прыкладам могуць быць танцавальныя вечарыны (рэдуты), ператварэнне прыватных садоў у камерцыйныя і інш.

Аднак сацыяльная і этнакультурная раз'яднанасць у асяроддзі прывілеяванага саслоўя Беларусі, якое падзялялася на розныя канфесіянальныя, рэгіянальныя і этнакультурныя групы, захоўвалася.

"Сармацкі" комплекс у шляхецкай культуры Беларусі ўсё больш замяняўся формамі, характэрнымі для буржуазнага грамадства Заходняй Еўропы.

Дэмакратызацыя, складванне гарадской культуры, фарміраванне новай сацыяльнай групы — інтэлігенцыі могуць лічыцца галоўнымі тэндэнцыямі ў культурным жыцці прывілеяванага грамадства Беларусі першай паловы XIX ст., што адбівалася таксама на змесце і структуры вольнага часу.

Такія тэндэнцыі былі ўласцівы ўсёй еўрапейскай культуры гэтага перыяду з распаўсюджанымі ў ёй ідэаламі эканамічнай карысці, палітычнай мэтазгоднасці.

[1] Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мн., 1990. С. 167; Залуский А. Время и музыка Михала Клеофаса Огинского. Мн., 1991. С. 143.

[2] Кісялёў Г.В. Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе". Мн., 2005. С. 234; Гісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917 г. Мн., 2001. С. 103; Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. Мн., 1997. С. 35; Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 1992. С. 78—79.

[3] Булгарын Ф. Выбранае. Мн., 2003. С. 97; Puzynina G. W Wilnie i w dworach litewskich. Pamiętnik z lat 1815—1843. Kraków, 1990. S. 7.

[4] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. Wrocław, 1970. S. 150.

[5] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. С. 92.

[6] Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. С. 150; Захарова О.Ю. Светские церемониалы в России XVIII—начала XX в. М., 2003. С. 144; Живописная Россия: В 12 т. Т. 3: Литовское и Белорусское Полесье. 2-е изд. Мн., 1994. С. 153.

[7] Пракапцова В.П. Спасціжэнне майстэрства. Мн., 2006. С. 108.

[8] Сыракомля У. Добрыя весці. Мн., 1993. С. 473.

[9] Без-Корнилович М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. 2-е изд. Мн., 1995. С. 219, 234; Живописная Россия. Т. 3. С. 249—266, 282.

[10] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. С. 130, 183, 225; Русецкий А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. Мн., 2001. С. 239; Живописная Россия. Т. 3. С. 126, 415—416, 424; Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска: Воспоминания старожила. Мн., 1995. С. 23; Мальдзіс А.В. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мн., 2001. С. 290; Felińska E. Pamiętniki z życia Ewy Felińskiej: Seria 1 / Tom 3. Wilno, 1856. S. 9, 11; Gołębiowski L. Gry i zabawy różnych stanów w kraju całym, lub niektórych tylko prowincyach. Warszawa, 1983.

[11] Савіч Ф. Успаміны // Літаратура Беларусі: Першая палова XIX стагоддзя: Хрэстаматыя. Мн., 2000. С. 238—243; Булгарын Ф. Выбранае. С. 74.

[12] Puzynina G. W Wilnie i w dworach litewskich. Pamiętnik z lat 1815—1843. S. 31, 106; Патоцкі У. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. С. 167; Шпилевский П.М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. С. 150.

[13] Живописная Россия. Т. 3. С. 129.

[14] Сакалова М. Пачатак ліберальнага руху на Беларусі // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Мн., 1999. С. 48—56.

[15] Літоўская гаспадыня, ці Навука аб утрыманні ў добрым стане хаты / Пер. з польск. Мн., 1993; Живописная Россия. Т. 3. С. 5, 118.

[16] Русецкий А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. С. 254.

[17] Маркс М. Записки старика // Віцебскі сшытак. 1997, № 3. С. 143; Odyniec A.E. Wspomnienia z przeszłosci opowiadane Deotyme. Warszawa, 1884. S. 36, 62, 86; Русецкий А.В. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. С. 249.

[18] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. С. 70, 74.

[19] Сяльверстава С. Фарміраванне сістэмы нагляду за культурай Беларусі ў канцы XVIII—першай палове XIX ст. // Беларусіка-Albaruthenica. Кн. 3. Мн., 1994 С. 47; Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. С. 93; Булгарын Ф. Выбранае. С. 80; Живописная Россия. Т. 3. С. 122.

[20] Баршчэўскі Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. С. 52, 141.

[21] Без-Корнилович М.О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии. С. 62—63; Беларускі народны каляндар. С. 61.

[22] Беларусы. Т. 6. Мн., 2002. С. 425.

[23] Ішчанка С. Аб прэстыжным шляхоцкім кані // Спадчына. 2003, № 2—3. С. 78; Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. С. 143.

[24] Ельскі А. Выбранае. Мн., 2004. С. 147; Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: Из истории белорусской медицины. Мн., 1987. С. 48; Жавускі Г. Успаміны Сапліцы / Пер. з польск. Мн., 2005. С. 26.

[25] Мальдзіс А.В. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. С. 265; Deszczyńska M. Homo ludens po polsku // Mówią wieki. 2001. № 6. S. 33; Гульні, забавы, ігрышчы. 3-е выд. Мн., 2003; Жавускі Г. Успаміны Сапліцы. С. 266; Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины города Витебска: Воспоминания старожила. С. 81.

[26] Мараш Я.Н. Очерки истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII века. Мн., 1974. С. 46.